## Данос

Беларускі народ збудзіўся, пачаў жыць сваім асобным жыцьцём, пачаў тварыць сваю нацыянальную культуру сваімі рукамі. Збудзілася вялікая жыцьцёвая сіла, захаваная ў грудзях дзевяцімільённай грамады. І гэтай сілы зьніштожыць нельга: яна ўзрастае з дня на дзень і будзе з кожным годам тварыць новае культурнае багацьце.

Ворагі нашага народу, не пакладаючы руку, „працуюць“, каб задзержаць беларускі рух. Яго закідвалі гразёю польскія чарнасоценцы з „Gaz. Codz.“ і інш., аб ім пісалі ўсялякую сьмешную брахню Кавалюкі і Саланевічы, каб толькі тутэйшае *грамадзянства* адвярнулася ад беларушчыны. Але дарма: ніводзін сумленны чалавек, ніводзін шчыры сын народу ня слухаў гэтай брахні, не даваў веры нягодным напасьцям.

Цяпер ворагі беларусаў з хаўрузіі чарнасоценцаў пайшлі другой дарогай: яны змагаюцца з намі подлымі, фальшывымі даносамі, клічучы *правіцельства,* каб яно сілай заціснула адраджэньне беларускага народу.

У казённай газэце „Россия“ ў № 2372 надрукаваны гэтакі фальшывы данос. Пад ім падпісаўся нейкі „Яков Нивич“; але пад гэтым іменем, напэўні, фальшывым, хаваецца, відаць, чалавек, каторы стаіць вельмі блізка да „ахраннага аддзяленьня“: лішне ўжо добра ведае ён, што знайшла паліцыя пры обысках у розных людзей — у вучняў Маладэчанскай сэмінарыі, у Мінскай публічнай бібліятэцы і т. д., — ведае, аб чым пісалася у знайдзеных у іх пісьмах. Нягледзячы на гэта, „агент–правакатар“ даносіць, каму трэба, быццам выдавецтва „Наша Ніва“ друкавала і шырыла між народам праклямацыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады, хаця ахраннаму аддзяленьню павінна быць вядома, што праклямацыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады друкаваліся ў 1903, 1904, 1905 і ў пачатку 1906 году[1] — у часе ўсерасейскай завірухі, а „Наша Ніва“ адкрылася толькі ў самым канцы 1906 году, калі ўсё ўжо супакоілася. Далей ён даносіць, быццам тая ж „Наша Ніва“ надрукавала рэвалюцыйныя брашуры „Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць“, „Чы хваціць для ўсіх зямлі“ і інш., хаця яны выйшлі ў сьвет перад выхадам „Нашае Нівы“ і на іх паказана зусім іншая фірма[2]. Адным словам, „агент–правакатар“ стараецца абвінаваціць чыста культурную, спакойную работу „Нашай Нівы“ ў „рэвалюцыю“[3], каб яе адміністрацыя зачыніла.

Мэта гэта „России“ зусім ясная. Цёмныя сілы нічога так не баяцца, як *сьвету.* Той сьвет шырыць „Наша Ніва“ і ўсе шчырыя беларусы, каторыя рупяцца аб долі[4] свайго народу. На іх і стараецца „Россия“ нацкаваць правіцельства. Фальшывы данос і ўся брахня агента–правакатара аб „рэвалюцыйнай“ рабоце нашай газэты — гэта толькі пустыя страхі. *Прасьвета народу, разьвіцьцё грамадзкай і нацыянальнай сьвядомасьці* — вось праўдзівы страх для чорнай сотні, для ўсялякіх нацыяналістаў і іх правакатарскай хаўрузіі.

Як лжэць „Россия“, бачым вось з гэтых яе слоў. Расказаўшы аб арыштах і обысках у Мінску і Маладэчне, каторыя былі ў 1908 і 1909 гаду[5], „Россия“ піша: „Пасьля гэтага „Наша Ніва“ замоўкла. Цяпер яна ізноў зацьвітае новым цьветам, пад новай фірмай. Выдавецтва гэтай газэты бярэ на сябе новы „варяг“, нейкі „Уласоў“, або „Власов“. Тым часам кожнаму вядома, што „Наша Ніва“ не „замаўкала“ ні на адзін мамэнт ад самага пачатку яе — ад 11 лістапада 1906 году, што А. Уласаў *не цяпер бярэ* на сябе выдавецтва газэты, а *ўзяў ужо бязмала сем гадоў таму назад — 8 дзекабря 1906 году.*

З усяго гэтага відаць, якую цану мае ўвесь данос, надрукованы ў „России“.

У канцы адзначым, што данос „России“ неяк сплятаецца з прыездам у нашу старонку міністэрскага чыноўніка зь Пецярбурга, нейкага Тэрмэна. Пасьля яго падарожы, як бачым, настаў у Пецярбурзе новы курс: ня веручы, каб Кавалюкі і Саланевічы здолелі задзержаць разьвіцьцё беларушчыны, ім ужо пакінулі даваць „цёмныя грошы“ ды пачынаюць выдумляць новыя спасабы, каб забіць жывы беларускі народ.